Источник: "Беларусь" - № 12, 2012-12-25



# На вагах гісторыі

**Што застанецца ў летапісах і даведніках пра 2012 год, які сыходзіць? Якія факты, падзеі з сёлетняга жыцця краіны будуць прыцягваць увагу нашчадкаў? Можна толькі здагадвацца. Час, а з ім і людзі гістарычнай навукі прасеюць усё, што сёлета здаецца нам надзвычай важным, затым яшчэ і ўзважаць "сухі астатак", апішуць, прааналізуюць… Што ж, пад Новы год, калі, вобразна кажучы, год стары з яго справамі здаецца ў архіў, самы час да такіх спецыялістаў завітаць**

Ці можна дбаць пра будучыню, увесь час паглыбляючыся ў мінулае? Як ні дзіўна, гісторыкі менавіта гэта і робяць. Многія з іх думкамі часцей, пэўна, на якой-небудзь стаянцы эпохі неаліту і бронзавага веку, дзе летам праводзілі чарговыя раскопкі, чым у сённяшняй рэальнасці. Праўда, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя свае навуковыя інтарэсы мае ў больш блізкім да нас часе. Ён даследуе малавядомыя і невядомыя старонкі, а часам і "белыя плямы" Вялікай Айчыннай вайны. У прыватнасці, яго доктарская дысертацыя прысвечана вытокам, структуры і дзейнасці прагерманскіх саюзаў моладзі на Беларусі ў 1941—1944 гадах. "Гэта першая ў айчыннай і замежнай практыцы грунтоўная праца, прысвечаная вывучэнню палітычна вострай праблемы, якая да апошняга часу не знайшла свайго навуковага абгрунтавання" — так адгукнуўся на працу, што выйшла і манаграфіяй, адзін з старэйшых калег аўтара.

А перад тым як расказаць пра свой шлях у гістарычную навуку, паразважаць над адметнымі падзеямі года, што адыходзіць, Аляксандр Аляксандравіч запрасіў мяне ў невялікае падарожжа ў беларускую мінуўшчыну. І адбылося яно ў Археалагічным музеі Нацыянальнай акадэміі навук. Дарэчы, з імпэтам тлумачыў мой суразмоўца, навукова-музейная экспазіцыя "Развіццё археалагічнай навукі ў НАН Беларусі", якая прадстаўлена ў акадэмічным Інстытуце гісторыі, — унікальная. Бо гэта адзіная спецыялізаваная экспазіцыя ў Беларусі, да таго ж аналагаў ёй няма і ў іншых краінах. Што ж, і сапраўды ўражвае: на параўнальна невялікай плошчы прадумана, з добрым мастацкім густам прадстаўлена ўсё самае лепшае і цікавае, каштоўнае для навукі, што знайшлі ў нашай зямлі падчас раскопак і зберaглі беларускія археолагі: косці мамантаў, наканечнікі стрэл, клады манет, цэлыя старажытныя паселішчы… Пра гэты музей варта будзе расказаць і асобна. А для Аляксандра Кавалені ён дарагі і тым, што экспазіцыя стваралася менавіта ў яго бытнасць дырэктарам інстытута з кастрычніка 2004 года. Адкрыўся ж музей у 2007-м, падчас Першага з'езда вучоных. Хоць падобная задума была ў беларускіх гісторыкаў яшчэ ў 30-я гады, калі разгортваў работу Інстытут беларускай культуры, папярэднік акадэміі.

Гутарылі мы з Аляксандрам Каваленем у прыгожа аформленай зале пасяджэнняў Інстытута гісторыі: яго цяпер узначальвае вучань акадэміка-сакратара Вячаслаў Даніловіч.

***— Аляксандр Аляксандравіч, адкуль у вас асабіста зацікаўленасць гісторыяй?***

— Хацеў бы сказаць — ад продкаў, ды, на жаль, мала пра іх ведаю. Памятаю дзеда па маці: Забела Аляксандр Андрэевіч, высокаадукаваны і паважаны чалавек быў, старшыня сельсавета. Мы з пісьменнікам, генеалогам Анатолем Статкевічам-Чабаганавым шукаем карані гэтага шляхецкага роду. І дзедава жонка, мая бабуля Юстына была з роду заможнага. А бацька з простых, як кажуць, людзей. Але скончыў Мазырскі педтэхнікум, працаваў некаторы час у Капыльскім райкаме партыі, я ў Капылі і нарадзіўся ў 1946-м. Бацькавы справы, яго партызанства і абуджалі мой інтарэс да гісторыі. Бо памятаюць Аляксандра Емяльянавіча Каваленю там і ў вёсцы Садкі, дзе пазней жыла наша вялікая сям'я, як настаўніка, дырэктара пачатковай школы, партызана. Бацьку ўсе паважалі, у яго два ордэны было — гэта высокая адзнака. І мяне знаюць у раёне найперш не як акадэміка-сакратара НАН Беларусі, доктара і прафесара — знаюць як сына настаўніка. Праз яго рукі прайшла моладзь усёй акругі. Яго і цяпер памятаюць: казалі тое землякі на нядаўняй навуковай канферэнцыі ў Капылі, дзе мяне ўшанавалі як ганаровага жыхара раёна.

***— Сапраўды, словы памяць і гісторыя — блізкія па сэнсавай напоўненасці…***

— Так, я падрастаў, калі была жывая памяць пра вайну. Усе настаўнікі, якія мяне вучылі, — удзельнікі вайны, хадзілі яшчэ ў салдацкіх шынялях. Так і абудзіўся мой інтарэс да гісторыі. Яны прыйшлі з фронту, іх высакароднасць, моц духу дзецям перадавалася. Нас вадзілі, помню, па мясцінах партызанскіх баёў. Мы прыводзілі ў парадак магілы землякоў. Потым і калі вучыўся ў Мінску ў вучылішчы будаўнічым, і



Іван Ждановіч. На вагах гісторыі




Акадэмік-сакратар Аляксандр Каваленя ганарыцца кнігамі па гісторыі, якія выдадзены ў Беларусі за апошнія гады

ІВАН ЖДАНОВІЧ

калі служыў у паветрана-дэсантных войсках — тэма вайны была найважнейшай. На ўсё жыццё запомніў, як адзін з маіх камандзіраў, удзельнік вайны, напісаў паэму пра Сапун-гару і так пранікнёна яе мне чытаў!

***— А самім стаць ваенным не хацелася?***

— Яшчэ як хацелася! Я нават да войска паступіў у ваеннае вучылішча, але трохі павучыўся ды зразумеў: не люблю хадзіць строем, і жыццё казарменнае — не па мне. Я чалавек свабоды. Увогуле навука не церпіць прымусу. У ёй добра тым, хто апантаны жаданнем пазнаваць нешта новае, а загадам — нічога не зробіш. Тут патрэбен рух душы. Што павінна быць сістэма, арганізацыя — зразумела. Плюс творчае асяроддзе. Сёння, на шчасце, у Інстытуце гісторыі ёсць дух творчасці.

***— Тое бачна і ў музеі, які вы мне паказалі...***

— А паглядзіце, што за кнігі выдадзены інстытутам у апошні час! Вось “Археалагічная спадчына Беларусі”. Гэта такі багата ілюстраваны альбом — можна паглядзець самыя цікавыя знаходкі. Прычым апісваецца хто, дзе, калі і што знайшоў. Такая мініэнцыклапедыя робіць гонар і краіне, і вучоным. Выданне кнігі — свайго роду падзея года, якая будзе помніцца. Як вядома, у 2009 годзе выйшаў першы том “Вялікага гістарычнага атласа”, цяпер заканчваецца праца і над другім, робяцца трэці і чацвёрты. Знакавае выданне: у краін-суседзяў няма такіх.

Летась мы правялі міжнародную навукова-практычную канферэнцыю “Рэспубліка Беларусь: 20 год незалежнасці”. Днямі выйшаў зборнік матэрыялаў. Гэта вельмі саліднае выданне для даследчыкаў. Сярод аўтараў — мэтры гістарычнай і паліталагічнай навукі. З усёй краіны кафедры ўдзельнічалі ў канферэнцыі. Кожны зрабіў свой унёсак у даследаванне навейшай гісторыі. Адзначылі гэты рубеж, засталася вяха. Адмеціна. Дарэчы, у акадэмічным інстытуце ёсць аддзел навейшай гісторыі Беларусі. Там яна і вывучаецца. А канферэнцыю мы арганізавалі сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Упершыню так маштабна і грунтоўна. Звярніце ўвагу яшчэ: “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” — таксама ўнікальнае выданне. Хутка павінен з’явіцца і другі том. Тут расказваецца, як узнікла ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці, як развівалася, рэалізоўвалася. Пачынаючы з часу знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі і да 2010 года. Такое грунтоўнае даследаванне зроблена ўпершыню ў нашай гістарычнай навуцы, гэта наша дасягненне. Такую кнігу варта мець у кожнай школе і ВНУ. Кажу гэта як спецыяліст, ведаючы школу: бо сам вучыўся на настаўніка, а потым доўгі час працаваў у Беларускім дзяржаўным педуніверсітэце імя Максіма Танка.

***— А складана ж, напэўна, пісаць гісторыю, калі яна яшчэ, што называецца, гарачая.***

— Маеце рацыю. Ды мы ж не прэтэндуем на “апошняе слова”: прыйдуць паслядоўнікі — зробяць лепш. А нам падалося важным адлюстраваць узровень навуковых поглядаў па гэтай праблеме. На наш час. Зрабіць такое — не папулярную кнігу напісаць. Тут за кожным словам ці датай немалая праца. А пісаць гісторыю, калі жывуць удзельнікі гістарычнага працэсу, —

вельмі складана. Імкнуліся ўсё апісаць навукова дакладна. Каб не перабольшыць і не пераменшыць. Варта пакінуць свой погляд на гэтую праблему. Потым можна і ўдакладняць. На чыстым лісце можна пісаць што заўгодна, а тут — пакінута наша бачанне. Час пакажа, наколькі мы ўлавілі тэндэнцыі і кірункі грамадскага руху. Вялікае, зразумела, лепш бачыцца здалёк. І тым не менш мы павінны сучаснікам паказаць, што зроблена за гэты час. Я шмат паездзіў па Беларусі ў апошнія гады. Як папрыгажэлі нашы раённыя цэнтры, гарады! Пасвятлелі вочы жыхароў. За 20 гадоў мы па-іншаму сталі глядзець на сябе і суседзяў, больш адкрыта і смела. Вам падабаюцца нашы аграгарадкі? Так, яны розныя, і на іх глядзяць па-рознаму. Але ў гэтай з'яве мы бачым рух наперад, імкненне даць агракомплексу імпульс для развіцця. Сёння Беларусь — адна з нямногіх краін Еўропы, якая корміць сябе сама. Мы і прадаем сельгаспрадукцыю высокай якасці.У нас, лічу, сельская гаспадарка ў добрым стане. Безумоўна, на сяле яшчэ многа праблем. І ўсё ж...

***— Як лічыце, Аляксандр Аляксандравіч: сёлета, здаецца, упершыню сабрана звыш 10 мільёнаў тон зерневых і кукурузы — гэта падзея застанецца ў летапісе краіны?***

— Абавязкова! І гэтым ганарыцца трэба ўсім грамадзянам, бо — дасягненне ж не толькі працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Я ўпэўнены: паказчык будзе і пераўзыдзены, калі не будзе экстрэмальных умоў надвор'я. Я ж памятаю, як 15 цэнтнераў з гектара было рэкордам. А сёння і 40 ніхто за высокі паказчык не лічыць. Ужо і па 90 у агракамбінаце "Сноў" збіраюць, і то не мяжа. А ў нас землі не самай высокай бальнасць, падзолістыя. А ўраджайнасць — сведчанне высокай культуры земляробства. Развітасці ўсёй інфраструктуры. І гэта ўсё зроблена рукамі нашых людзей, талентам нашых вучоных. Таму і ў кнігах мы такія вехі, рубяжы адлюстроўваем. Сёння, вы ж ведаеце, знакамітыя радкі класіка пра мужыка-беларуса як пана сахі і касы — цікавыя як своеасаблівы "пункт адліку". Быў час, калі мы з таго пачыналі. А сёння мы — людзі высокага інтэлектуальнага і культурнага ўзроўню. Наперакор усяму, што было ў нашай няпростай гісторыі.

***— А чаму, канкрэтызуйце, наперакор?***

— Ну не толькі гісторыкі добра разумеюць: Беларусь — на геапалітычным скрыжаванні ў цэнтры Еўропы. Тут пастаянна, быццам вывяржэнні новых энергій, ідуць глабальныя духоўныя працэсы. Дзясяткі войнаў прайшлі па гэтай тэрыторыі смяротным агнём, што вынішчаў як людзей, так і набыткі іх працы, адкідваў грамадства назад, тармазіў яго рух наперад. Нехта налічыў ці не сто ваенных канфліктаў, якія па нас пракаціліся! А мы тым не менш столькі захавалі свайго адметнага, нацыянальнага — можа нават больш, чым суседзі. Традыцый. Уяўленняў пра ўладкаванасць свету і шляхі да гарманічнага існавання ў ім. Напрыклад, мы лічым, што памяркоўнасць, талерантнасць, адкрытасць, а не жорсткасць і бескампраміснасць, "двайныя стандарты", як тое бачым у некаторых іншых культурах, ёсць шлях да працвітання грамадства. Мы захавалі сваю мову, культуру, традыцыі, духоўныя і матэрыяльныя здабыткі — хоць нямала і было вывезена твораў мастацтва, кніг, каштоўных архіваў і за межы краіны. Па жорсткіх, амаральных законах ваеннага часу. Скажам, у час нямецкай акупацыі мы маглі ўвогуле застацца без Белавежскай пушчы: яе няшчадна высякалі. І тое, што мы пра сваю такую духоўную стойкасць не заўсёды ўмеем расказаць наступнікам, сябрам з замежжа, што не заўсёды ўмеем тым ганарыцца padобраму, — гэта наш недахоп. Таму сёння Інстытут гісторыі выпраўляе перакос.




***— Якім чынам?***

— Навукоўцы-гісторыкі не толькі, вобразна кажучы, капаюць у мінулым, але і сеюць для будучыні: папулярызуюць нашу багатую гісторыка-культурную спадчыну. І дасягненні. Мы штогод праводзім дзясяткі розных мерапрыемстваў, у тым ліку і па рэгіёнах. Сёлета я пабываў, выступаў на 46 розных канферэнцыях. Мы імкнемся данесці гэтыя веды да людзей, да абываценя. Я ўжо згадваў Капыль, гэта свежы прыклад. Там настаўнікі гісторыі, дырэктары школ гадзіны паўтары мяне тармашылі: мы гаварылі не толькі пра багатую гісторыю Капыльшчыны — на самыя розныя тэмы. А навуковая

канферэнцыя “Капыль: гісторыя ад старажытнасці да сучаснасці” прысвячалася 360-годдзю надання гораду Магдэбургскага права. Ладзіў яе Інстытут гісторыі разам з райвыканкамам. Было тры секцыі — і на ўсіх поўна людзей, да вечара ніхто не пайшоў. Секцыі працавалі ў гімназіі, музеі, райвыканкаме. І будуць яшчэ выдадзены матэрыялы канферэнцыі — гэта, дарэчы, цяпер як закон: усе матэрыялы канферэнцый выдаем. У Капылі і школьнікі выступалі з паведамленнямі. Мы адзначылі лепшых з іх, хто займаецца вывучэннем гісторыі родных мясцін. Аб’явілі падзякі інстытута — так заахвочваем маладых у іх цікавасці да гісторыі.

***— Цікавасць праяўляюць і людзі, на першы погляд далёкія ад гісторыі. Напрыклад, добра знаёмы вам прадпрымальнік, пісьменнік Анатоль Статкевіч-Чабаганаў, які нядаўна ўганараваны дыпломам Міністэрства інфармацыі “Мецэнат кнігі”. І прадстаўнікі суполак беларускай дыяспары ў Расіі, пабачыўшы яго кнігі на нядаўняй сустрэчы ў пасольстве, праявілі вялікі інтарэс да серыі “Я — сын Ваш. Летапіс беларускай шляхты”.***

— Такія людзі павінны быць. Шмат робіць і Анатоль Васільевіч. Кнігі яго пайшлі па ўсім свеце, ён выступае з цікавымі паведамленнямі на навуковых канферэнцыях. Гэта цудоўны, але, на мой погляд, недастатковы пачатак. Бо такіх руплівых даследчыкаў павінна быць сто і больш. І таму мы разам з Анатолем Васільевічам задумалі зрабіць грамадскую ці якую іншую арганізацыю, каб падняць пласт радаводаў і іншых людзей. Тады і гісторыя нашай Бацькаўшчыны будзе зусім па-іншаму глядзецца.

***— Перадаючы ў дар Нацыянальнай бібліятэцы свае кнігі, даследчык гаварыў пра фонд, які мог бы каардынаваць дзеянні. У некага, напрыклад, ёсць грошы і жаданне нешта даведацца пра свой радавод. У другога — веды, каб гэта расшукаць па архівах. У трэцяга — журналісцкі ці пісьменніцкі талент, каб напісаць гісторыю, распытаць жывых яе сведкаў...***

— Ідэя добрая, і яна не страчана: мы абмяркоўвалі яе ўжо некалькі разоў, у тым ліку і на міжнароднай канферэнцыі ў Полацку. У даследчыка падыход такі: вось дакумент, і я яго публікую. А нас як навукоўцаў цікавіць і аналітычны бок. Як гэтыя роды суадносіліся паміж сабой? Калі гэты пласт будзе ўзняты, а мы здолеем апублікаванае прааналізаваць, зрабіць высновы, аналітыку — то гэта будзе вялікая справа.

> **“ АДЗІН ЦІКАВЫ ФАКТ: КАЛІ МЫ, ЗАЙМАЮЧЫСЯ ДАСЛЕДАВАННЕМ ГІСТОРЫІ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ, ПАЕХАЛІ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ, ТО ЗНАЙШЛІ ТАМ ДАКУМЕНТЫ... ЛЫКАМ ЗВЯЗАНЫЯ! ІХ ЯК ЗВЯЗАЛІ Ў XVII ЦІ XVIII СТАГОДДЗІ — ТАК ЯНЫ І ЛЯЖАЦЬ ПА ГЭТЫ ЧАС БЕЗ УЖЫТКУ. А ГІСТОРЫЯ — ГЭТА ЖЫВАЯ НАВУКА**

— Я не адкрыю сакрэта, калі скажу: у савецкі час, як іншым разам мы горка жартавалі, уся гісторыя наша пачыналася з 1917 года. Сёння ж — зусім іншы погляд на мінулае. І мы павінны напаўняць фактамі пройдзены народам велізарны прамежак часу. У тым ліку і глядзець: што дала Беларусь свету? Якія таленты родам з нашай Бацькаўшчыны? Мы, напрыклад, узнялі Казіміра Семяновіча, які ўжо 260 гадоў таму сфармуляваў ідэю шматступенчатай ракеты. І такіх людзей вельмі многа! Для таго каб абудзіць цікавасць да сваіх родавых каранёў, добрую справу

***— Я ведаю, Інстытут гісторыі шмат робіць па вывучэнні гісторыка-дакументальнай спадчыны. У прыватнасці, вялікія надзеі ў навуковай грамадскасці ёсць на архівы замежных краін...***

— Сапраўды, у фондах архіўных знаходзіцца каля 600 кніг “Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага”. Там сабрана наша медывістыка, сярэднявечча беларускага народа. Мы выдалі ўжо восем кніг, дзявятая рыхтуецца. Дакументы выдаем з каментарыямі. Мы мяркуем выдаць каля 100 кніг, у якіх ёсць адлюстраванне гісторыі сучаснай тэрыторыі Беларусі. Гэта зробіць нашу гісторыю больш аб’ектыўнай. Будзе ў ёй менш рознага роду дадумак, гіпотэз, а часам і спекуляцый. Пасля гэтага можна будзе ўжо на фактах рабіць нейкія абагульняючыя, фундаментальныя працы. Сёння мы тым займаемся з нашым дэпартаментам па архівах, з Уладзімірам Адамушкам. Вядзем карпатлівую працу па публікацыі дакументальных крыніц, магчыма, нават саступаючы аналітыцы. Хай будзе нашчадкам — яны асэнсуюць. Трэба ўзняць важны пласт дакументальных матэрыялаў. Адзін цікавы факт: калі мы, займаючыся даследаваннем гісторыі Белавежскай пушчы, паехалі ў Санкт-Пецярбург, то знайшлі там дакументы... лыкам звязаныя! Іх як звязалі ў XVII ці XVIII стагоддзі — так яны і ляжаць па гэты час без ужытку. А гісторыя — гэта жывая навука, і факты гістарычныя пастаянна ўдакладняюцца, калі знаходзяцца невядомыя дакументы. Пакуль да вялікага масіва дакументаў не дакраналіся рукі і розум гісторыкаў. Тое, што робіць Інстытут гісторыі, не зробіць ніхто іншы. Дакументы праглядваюць, каментуюць прафесійныя гісторыкі. А хто працуе сёння ў ВНУ і мае 800 гадзін лекцый — яму няма калі паехаць папрацаваць у архівах. І гонар Інстытута гісторыі — што знаходзяцца сродкі для таго, каб ездзіць па архівах замежных краін. Хоць паездкі не заўсёды плённыя, але можна, калі пашанцуе, за адзін дзень зрабіць адкрыццё. Як на раскопках. Тут мы ідзём у значнай ступені па цаліне. І гэта гонар для інстытута, што мы тым займаемся. Мы падаем нашу гісторыю — як павінна яна падавацца ў незалежнай дзяржаве. Гэта нацыянальны погляд на нашу гісторыю. Інакш проста не патрэбны гісторыкі. Дзеля чаго нам дзяржава выдзяляе сродкі? Каб была наша айчынная гісторыя, напісаная нашымі гісторыкамі. Але мы не замыкаемся, актыўна і цесна супрацоўнічаем з Украінай, з расіянамі. У прыватнасці, шэраг дамоў заключаны з Маскоўскім дзяржуніверсітэтам, з Інстытутам славяназнаўства, Інстытутам усеагульнай гісторыі РАН, працуем з гісторыкамі Сібіры. Так і пішацца наша гісторыя.

Іван **Ждановіч**